ГОЛАС ПРАЎДЫ

ГОЛАС ПРАЎДЫ

АДНАДНЁЎКА

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Палтаўская, 13—6.

Аўторак 27 сьнежня 1921 г.

Цана нумару 25 мар.

Што рабіць?

З усіх канцоў краю даходзяць весткі, што настрой насяленьня вельмі ня прыхільны да выбараў у ладжаны палякамі Сойм Вільні. І гэта справядліва; народ, бяз ніякае агітацыі, сваім здаровым розумам дайшоў, што пад цяжкой польскай уладай ні аб якім выяўленьні волі народнай ня можа быць і гутаркі, што палякі так ужо ўсё змайстравалі, што нікога, няпрыхільнага да польскага панаваньня над намі, у гэны сойм ня пусьцяць і так сама не дадуць голасу, як не давалі на аляксюкоўскім зьезьдзе! Але народ ня ведае, што рабіць?

Вось на гэтае пытаньне мы і хочам адказаць:

Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні ужо зрокся ўсялякага ўчасьця ў такіх выбарах, пры каторых народ пазбаўлены магчымасьці высказаць сваю запраўдную волю. Выбары робяцца ў гэткіх ненармальных варунках дзеля таго, каб ніхто ня мог перашкодзіць сойму прылучыць нашу Бацькаўшчыну да Польшчы, накінуць нам цяжкае ярмо панскае ўлады. І беларускае арганізованае грамадзянства сваей пастановай аб выбарах як быццам сказала палякам: можаце нас прылучыць г в а л т а м,—на гэта ў вас ёсьць штыхі вашых салдатаў; але ніхто з беларусаў не павінен прыкладаць сваей рукі да гэтага гвалту, не павінен даць на гэта сваей згоды!

На жаль, знайшліся здраднікі паміж беларусамі, якія за польскія грошы згадзіліся падаць самазванна—нібы-то ад імя ўсяго беларускага народу—свой голас, за аддачу нашае Бацькаўшчыны Польскай дзяржаве. Гэта—вядомы злодзей і нягоднік Аляксюк і створаная ім „Краёвая Сувязь“. Яны, ламаючы пастанову ўсяго арганізованага беларускага грамадзянства, выстаўляюць свае сьпіскі кандыдатаў у гэны самы фабрыкованы сойм, каб там перад усенькім сьветам прасіць Польшчу узяць нас пад сваё панаваньне.

Беларусы! Ведайце, што кожны з Вас, хто падасьць на выбарах свой голас за аляксюкоўскія сьпіскі, гэтым зробіць нягодны ўчынак, бо паможа здраднікам нашага народу прадаваць нашу Бацькаўшчыну!

Беларусы! Агледзьцеся навакол, палічыце ўсе нялічаныя крыўды Вам, зробленыя польскаю ўладаю за трохгадовае панаваньне яе над намі, і самі разсудзіце, што чакае Вас і Вашых дзяцей, калі наш край будзе аддадзены пад уладу польскага панства!

Беларусы! Няхай у дзень выбараў, ужо недалёкі, ніводная рука не паднімецца, каб падаць голас за аляксюкоўскія сьпіскі! Ведайце, што ніводзін запраўдны беларус, ніводзін запраўдны сын Беларускага народу не згадзіўся выстаўляць сваей кандыдатуры ў сойм, і тыя, што запісаны ў сьпіскі, гэта сьвядомыя адступнікі і здраднікі нашага народу!

І няхай гэтыя нашы словы, гэты наш голас паможа Вам самым знайсьці адказ на пытаньне: што рабіць?

Апавяшчэньне

Беларускага Нацыянальнага Камітэту.

З прычыны паяўленьня ў газэтах вестак аб так званым „Зьездзе Заходняе Беларусі“, які адбыўся ў Вільні 11 і 12 сьнежня г. г., Беларускі Нацыянальны Камітэт, як адзінае прадстаўніцтва ўсяго арганізованага беларускага грамадзянства, гэтым падае да агульнага ведама ніжэйпісанае:

Сказаны зьезд быў скліканы не якой-колечы беларускай нацыянальнай установай, а так званай „Краёвай Сувязьзю“, ў каторай арганізованае беларускае грамадзянства не прадстаўлена;

на зьездзе ня толькі ня былі запрошаны ніякія беларускія грамадзкія арганізацыі, але навет прадстаўнікі іх, якія памыкаліся праніцнуць на гэны зьезд, былі груба выдалены, ды некаторыя навет пабіты арганізатарамі „Краёвае Сувязі“, і зьезду;

зьезд складаўся не з прадстаўнікоў шырокіх масаў Беларускага Народу, а выключна з прадстаўнікоў лёкальных арганізацыяў тэй жа „Краёвай Сувязі“ і асоб, пэрсанальна запрошаных агентамі „Краёвай Сувязі“;

іншыя с ўчасьнікаў зьезду запрашаліся на яго як-быццам выключна дзеля школьных спраў, папраўдзе-ж зьезд насіў ярка палітычны характар;

на самым зьезьдзе ўчасьнікі былі тэрорызованы арганізатарамі, і тыя хто быў западозраны ў няпрыхільнасьці да палітычных мэт „Краёвай Сувязі“, ня толькі не дапускаліся да голасу, але навет пазбаўляліся зацьверджаных ужо мандатаў і груба выдаляліся з салі зьезду,

такім парадкам зьезд, шумна названы „Зьездам Заходняе Беларусі“, зьяўляецца зьездам выключна арганізацыі „Краёвае Сувязі“, і пастановы яго ні ў якім прыпадку ня могуць быць прызнаны за голас беларускіх народных масаў Заходняе Беларусі.

Alaksiukouski zdradnicki zjezd.

U Wilni 11 i 12 śnieżnia siol. hodu adbyŭsia „Biełaruski“ alaksiukoŭski źjezd.

CHTO BYU NA ZJEZDZIE?

Na źjezdzie było niešta caławiek 50—60 ašukanych sialan, a rešta ŭsio pany, padpanki i šmat polskich špiehaŭ.

CHTO ZJEZD SKLIKAU?

Sklikaŭ jaho Alaksiuk, byŭšy biełarus, a ciapier panski najmit, jakoha kupili pany i zahadali jamu tak skakać, jak pan zajhraje.

A CHTO TAKI ALAKSIUK?

Alaksiuk heta toj byŭšy caławjek, jaki ...„hrošy lubić nia tolki brać, jak ich dajuć, ale lubić i ŭkraści“... («Беларускі Голас“, Adnadnioŭka 11. XII. 21.)

ČAMU ALAKSIUK SŁUCHAJE PANOU?

Jon heta robić, kab zahładzić swaje hrachi. 9-ho śnieżnia siol. hodu ŭ sudzie mieła raźbiracca jaho sprawa ab kraży paŭmiljona polsk. mar. A dziela taho, što jon staŭsia słuhoju panoŭ, dyk pany sud adłażyli. Ale sud hety niekali budzie, dyk Alaksiuk starajecca mieć łasku ŭ panoŭ, kab jany jaho ratawali.

A NASZTO PANOM PATREBNY ALAKSIUK?

Panom duża patrebny Alaksiuk. Alaksiuk nastolki ŭžo niasumlenny, što jašče zawie siabie biełarusam. A sojm, da jakoha majuć być wybary, adbudziecca, kab wyjaśnić dolu našaho kraju, ŭ jakim žywuć i palaki, i biełarusy i lićwiny i žydy. Dyk woś kali tolki wybirać u heny sojm buduć adny palaki dyk heny Sojm nia budzie mieć nijakaha značeńnia, bo adny palaki nia mohuć pastanawić ab doli našaha rožnaplamiennaha kraju. Dziela hetaha palaki, (asabliwa pany) i kupili Alaksiuka, pamahli jamu sklikać źjezd byccam biełaruski, kab na henym źjezdzie biełarusy pradali siabie panom i kab ab hetym wiedała Liha Narodaŭ.

Dyk niaŭžož na Alaksiukouskim źjezdzie nia było biełarusaŭ?

Byli biełarusy ciomnyja, ašukanyja, kuplenyja (im płacili pa 3000 m. u sutki), byli našy abmanutyja sialanie i niekulki panskich, abo Alaksiukoŭskich prychwostnikaŭ. A što datyčyć Biełarusaŭ, Biełarusaŭ świetłych, intelihentnych, zasłužanych, ŭžo daŭno pracujučych na niwie biełaruskaj dziela lepšaj doli sielanina Biełarusa, takich Biełarusaŭ na źjezdzie Alaksiukoŭskim n i a b y ł o. Praŭda, hetyja Biełarusy, widziačy strašnaje ašukanstwa biednych swaich chlebarobaŭ, pajšli na źjezd, ale ich alaksiukoŭskija najmity abo wyhnali, abo pabili (jak heta było z biełaruskimi studentami).

A szto-ž źjezd Alaksiukouski pastanawiŭ?

Jon pastanawiŭ, kab ziamla naša była pryłučana da Polšču i z rukami i z nahami biaz nijakaha dla siabie prawa. Zjezd heny wyraksia swajej woli, swajho sialanstwa, s w a j h o p r a w a n a z i a m l u, a pastanawiŭ toje, što palaki chacieli. Palakiž chočuć, kab było lepš pradusim dla siabie, paśla dla nas, biednych sialan Biełarusaŭ.

Kali tak, dyk niaužož na źjezdzie nie znaszousia ani adzin biełarus—sialanin, jakib wystupiu prociu takich pahanych zdradnickich pastanou?

Nia łohka było heta zrabić. Chto prabawaŭ wystupać i hawaryć praŭdu, dyk taho alaksiukoŭskija najmity bili. Ale ŭsioždyki znašlisia ludzi, jakija nia hledziačy, što ź imi abchodzilisia na Alaksiukoŭskim źjezdzie duža kruta, ŭsiožtyki paŭstali prociŭ henaj podłaj alaksiukoŭskaj raboty. Henyja Biełarusy pakinuli źjezd i napisali pratest prociŭ takich źjezdaŭ i sami padtakimi pratestami padpisalisia. Usie takija swaje pastanowy i pratesty jany pierasłali ŭ Wilenski Biełaruski Nacyjanalny Kamitet.

A szto-ž rabić, kali Alaksiuk pastawić siabie i sabie padobnych jak kandydataŭ u sojm u Wilni i budzie namaulać, kab sialanie Biełarusy dawali swaje hałasy u taki spisak?

Biełaruskaje sumleńnie niachaj padychtuje wam, Braty Biełarusy, jak prawasłaŭnyja, tak i kataliki, što Wy majecie ŭ takim zdareńni rabić. W y n i e p a w i n n y d a ć A l a k s i u k u, s w a j m u, k a t u, a n i a d n a h o h o ł a s u! Wy nie pawinny zdradzić swaju ziamlu, swajho brata siarmiažnaha! Usie Biełarusy pawinny družna stajać za swajo harotnaje sialanstwa! Proč Alaksiukoŭ, proč zdrajcaŭ padniawolnaha biełaruskaha sialanstwa!

Siarmiažnik.

Szto skazali sialanie na Alaksukouskim Zjezdzie.

Polskija najmity; Alaksiuk i ŭsia banda, jakaja zhurtawałasja u tak-zwanaj „Krajowaj Suwiazi“, sklikaŭšy za polskija hrošy sfałšawany „Zjezd Zachodniaj Biełarusi“, paličyli, što im užo para źniać maski i wystupić z adkrytym — twaram Judy zdradnika.

Zjezd heny byŭ patrebuy dla Lihi Narodaŭ: palaki chacieli pakazać, byccam Biełaruski narod sam prosicca pad polskaje jarmo, pad polski pryhon. I woś na źjezdzie złodziej Alaksiuk. wypuščany palakami specyjalna dziela hetaha z wostrohu, ad imia Biełaruskaha Narodu zajawiŭ, što Biełaruś tolki taho i žadaje, kab nad joj panawaŭ, jak niekali, polski pan,

Памятайце, што на выбары Беларусы няйдуць!

kab pa śpinie biełaruskich sialan iznoŭ zahulaŭ panski bizun...

Błaha, kazaŭ Alaksiuk na źjezdzie, było Biełarusam pad maskoŭskim panawańniem. Maskali ich usialak uciskali i kryŭdzili. Ale błaha budzie Biełarusam i tady, kali jany dabjucca niezaležnaści: im, patrebien nowy pan, nowy waładar. Takim panam maje być Polšča.

„My wiedajem,—kazaŭ Alaksiuk,—što tamaka, ŭ Rasiei, i ciapieraka istnujuć tyja samyja kajdany. A tut, u PolšČy, hetaha niama i nia budzie!“

I woś jon prapanuje źjezdu ŭ pieršy čarod pasłać prywitalnyja telehramy nowym panom...

Telehramy pasłany. Abałamučanyja sialanie, zaklikanyja roznymi chitrykami na heny źjezd; nie paśpieli ahladziecca, jak apynulisia «tut, u Polščy“.

Ale wiedaŭ Alaksiuk, čamu hetak śpiašaŭsia z telehramami: bo tyja-ž sialanie, krychu adumaŭšysia, na druhi dzień wyniaśli rezalucyi, ŭ jakich dali wielmi jarki abraz tej niawoli, taho polskaha ździeku i hwałtu nad našym narodam, jaki my spaznali za try hady polskaje haspadarki na ziamli Biełaruskaj. Wiedama, hetych rezalucyj Lizie Narodaŭ nie pakažuć: u ich—zapraŭdny abwinicielny akt proci „bratniaj“ Polščy!

Szto-ž skazali sialanie, jakich sabraŭ Alaksiuk?

Jany adnahałosna paćwiardzili ŭsio toe, što skazaŭ Biełaruski Nacyjanalny Kamitet, admaŭlajučysia ad učaścia ŭ wybarach u tak zwany Wilenski Sojm. Razhledzim ich pa punktach.

2. U sprawie pomačy ŭciakačom:

„Niaščasnaja Biełaruś u bolšaj swajej čaści apływaje krywioju pad terorystyčnym uradam maskoŭskich kamunistaŭ. Szmat biełaruskich siemjaŭ, jakim pahražała katawańnie črazwyčajak, raskinulisia pa Polščy, pa pryfrantowaj pałasie biez adzieży, biez strachi. Ludzi henyja hinuć i wymirajuć u samych strašennych warunkach...“

A što na heta Polski ŭrad—toj urad, jakomu Alaksiuk šle prywitalnyja telehramy? Dy ničoha: Polski ŭrad spakojna pryhladajacca da hetaha wymirańnia Biełaruskaha narodu i ciešycca, što mienš kłopatu budzie... Polskj urad tak „miłaściwa“ sustrakaje i tych uciakačoŭ z Horadzienščyny, jakich niekali wyhnali z rodnych chat ŭ dalokuju čužynu maskali, što wiazie ich ad maskoŭskaje hranicy da ich wiosak u marazy ŭ niatoplanych wahonach i paśla „wyhružaje“ dziesiatkami zamarožanyja trupy, kab pachawać na rodnaj ziamli... A nadzieły ŭciakačoŭ pad hety čas addajucca polskim žaŭnieram—zhodna z pastanowaj polskaha uradu i Waršaŭskaha sojmu...

3. Pa ekanamičnamu pytańniu.

1. Pryzwać polski ŭrad, kab nie rabiŭ zhubnaje haspadarki u Bieławieżskich lasoch.

Punkt 2 ściwardžaje, što miajscowyja polskija ŭłady robiać pieraškody biełaruskamu ekanamičnamu ruchu.

Punkt 4 haworyć ab patrebie dziaržaŭnaha kredytu dla kooperatywaŭ biełaruskich,—jasna, zatym, što takoha kredytu polski ŭrad nie daje!

4. Pa školnamu pytańniu.

U punkcie 1 haworycca ab patrebie pryniaćcia biełaruskich škoł, jakich choča nasialeńnie, na dziaržaŭny košt,—značyć, jasna, što polski urad nia tolki nie prynimaje takich škoł na dziaržaŭny košt, ale i nie dapuskaje adkrywańnja biełaruskich škoł naahuł, choć taho choča nasialeńnie!

U punkcie 2 jasna haworycca ab hwałtach polskaje ŭłady nad biełaruskimi školami, haworycca, što „pawiatowyja inspektary i miascowyja ułady pawinny spynić swaju warožuju baračbu z biełaruskaj škołaj.“

Punkt 3 trebuje „pierastać wywozić biełaruskaje wučycielstwa na kursy ŭ Polšču.“

Punkt 8 trebuje „pieramiaścić zaraz-ža z biełaruskich škoł polskich wučycialoŭ i wučycialek, prysłanych školnymi inspektarami nasilna, hdzie sialanstwa ich nia choča“

Značyć, źjezd śćwiardžaje, što polskaja škoła nakidajecca nam polskim uradam hwałtam!..

Urešcie 6 rezalucyja—pa „ziamielnamu pytańniu“.

U punkcie 1 žadajecca prawiadzieńnie ziamielnaje reformy na Biełaruskich ziemlach, — jasna, zatym što polskaja konstytucyja, choć i uchwaliła hetu reformu, nadzialać biełarusaŭ zusim nia źbirajecca!

U punkcie 2 haworycca, kab pry parcelacyi majontkaŭ ziamla išła ŭ padzieł tolki miž miascowym sialanstwam. Heta tak sama jasna: nie na toje Polšča zabiraje Biełaruś, kab ziamlu dzialić pamiž biełarusami, a kab wysialić na našy abšary lišku swaich biezziamielnikaŭ i našym koštam zachawać panskija dwary ŭ samaj Polščy!..

Punkt 4 pratestuje proci niščeńnia našych lasoŭ u cełym radzie pawietaŭ, jak-to: Baranawickim, Łuninieckim, Nieświžskim, Staŭpieckim, Ašmianskim i inš, i damahajecca drewa na patrebu biełaruskaha sialanstwa,—bo dla nas jaho niama!..

Woś što adkazali sialanie swaimi rezalucyjami na abłyžnyja hutarki Judy-Alaksiuka ab „woli“ ŭ Polščy. I choć Alaksiuku ŭdałosia nachrapam wyrwać u hetaj žmieni sabranych jaho ahientami paadzinokich sialan „prywitalnyja telehramy“ tym, chto nas dušyć mo' jašče horš za maskaloŭ, choć i prawioŭ jon rezalucyi ab wybarach u fałšawany Wilenski Šojm, usio-ž sialanie, jakija byli na źjezdzie, šmat čaho zrazumieli i nawučylisia! Zrazumieli jany jakaja „wola“ nas ždzie pad polskim bizunom, zrazumieli, kudy ich pawiali panskija najmity, i z ślaźmi na wačoch apawiadajuć doma, jak Alaksiukoŭskaja „achranka“ biła i wykidała sa źjezdu kožnaha, kožnaha, chto maniŭsia skazać publična, prad usimi słowa praŭdy ab polskaj palitycy i polskaj łascy...

Chto skazaŭ: „i ja z narodam“,
Chto z im popleč staŭ, jak z bratam,
Chto pajšoŭ z im roŭnym chodam
K roŭnym zyskam, k roŭnym stratam, —
— Z tym i ja. Nichaj ža liča,
Budzie treba — chaj pakliča.

Chto-ž skazaŭ, a potym zdradziŭ,
Chto pajšoŭ, a potym kinuŭ,
Chto ŭ dušy sumleńnie zhładziŭ,
U kim apošni soram zhinuŭ —
— Chaj dryžyć! U dzień prysudu,
U strašny dzień ja świedčyć budu!

Aleś Harun.

Нішчэньне беларускай нацыі.

(Пісьмо з Гарадзеншчыны).

Ад пачатку 1918 г. пачалі варочацца з Расеі да сваей Бацькаўшчыны нашы ўцякачы.

Варочаюцца галодныя, босыя, голыя. У цёплы час палавіна ўцекачоў у вагонах вымерла ад тыфусу і другіх хвароб, а цяпер, зімою, то ад хвароб, голаду і марозу.

Гэтымі днямі прыехала некалькі сем'яў з вёскі Раневічы, Сьвіслацкай воласьці. Дзьве сям'і — адна сем душ, другая восем — памёрзьлі ў Баранавічах, так што ў аднэй асталася толькі дзевачка, а ў другой хлопец лет 12. „Бежанцы“ ўсе апавядаюць, што з вагонаў кажны дзень выкідаюць па пяць — восем трупаў зьмерзшых людзэй. Хворые бежанцы цэлымі нядзелямі валяюцца па станцыях бяз жаднай дапамогі з боку польскае ўлады.

Так, у Сьвіслачы кабета-ўдава з дзіцём пры грудзёх і другім лет 6 з вёскі Пуцкі, Сьвіслацкай воласьці, дзьве нядзелі праляжалая хвора на станцыі, покуль свае аднасельцы не даведаліся і не забралі яе ў свае зямлянкі, бо вёска ўся спалена.

Ня лепшае палажэньне і тых, якія вярнуліся ўж раней да сваей роднай хаткі. Няпрыветна спаткала іх родная старонка. Іншыя вёскі (самаму давялося бачыць!) як Лепісы, Берастовічане, Лесьневічы, Жабры, сяло М.-Берастовіца, М.-Берастовіцкай воласьці, большая палова вёскі Блюсканоўцы В.-Бярастовіцкай і вёскі Пуцкі, Салаўкі, Несьцяравічы, Канчыцы, Казейкі, Сьвіслацкай воласьці — спалены ў шчэнт, навет і месца не пазнаеш, дзе калісь цьвіло і красавала жыцьцё. Бедныя ўцякачы, якія як найхутчэй стараліся вярнуцца ў сваю бацькаўшчыну, дзе іх, па славам польскіх агентаў у Расеі, чакае „райскае жыцьцё“, цяпер, убачыўшы ўсю праўду, заліваецца горкімі сьлязамі. — Ня толькі абяцаных каней і кароў дарма ня даюць, але навет дошчак на зямлянкі, хворасту на апал — і гэтага не даюць, а за ўсё трэба плаціць грошы. І от селяне вёсак Лепісы, Берастaвічан, М. Берастовіцы, Пуцак, Кватэрак парабілі сабе зямлянкі — норы, а вёскі Лесьневічы, Жабры, і інш. — якіясь сабаччыя буды і так жывуць. А якое гэта жыцьцё, — кожнаму ведама. Кажын дзень павялічываюць яны лічбу белых крыжыкаў на магілках, а ёсьць такія сем'і, як у Лепісах дзе ўся сям'я вымерла з голаду.

Дрэва з нашых лясоў прадаюць за граніцу для падняцьця польскай маркі, а людзі здыхаюць у сырых зямлянках; калі-ж хто хоча купіць, то за адну дзераўіну заплаці чатыры — пяць тысячаў марак. Вось і купі, чалавеча, з свайго лесу, пабудуйся! Навет гальлё на апал — і тое прадаецца па трыста марак за воз. Мяйсцовае насяленьне, якое не выяжджала, і тыя, хто ўжо ўперад вярнуўся з Расеі, мала могуць памагчы. Прычынаю гэтаму ёсьць прашларочняя польска—бальшавіцкая вайна, якая зьнішчыла нашых людцоў, а найбольш — гэта панскія парадкі

А польская ўлада глядзіць на гэта, ніякай помачы не дае і жджэ, калі гэта вымруць так нямілыя польскім паном беларусы, калі на іх зямлі можна будзе свабодна, бяз ніякіх перашкод, рассяліць польскіх калянiстаў і ўрэшце абярнуць Беларускую зямлю ў Польшчу!

З—ы.

„Swaboda“ biełaruskaj szkoły.

Sialanie m. Swisłačy i wakolic, jakija mieli biełaruskija škoły ad času wychadu maskaloŭ, źwiarnulisia da polskaj ŭłady z hetkaj prośbaj ab škołu ŭ rodnaj mowie:

Do Pana Inspektora Szkolnego
powiatu Wołkowyskiego.

My, niżejpodpisani, gospodarzy m. Swisłoczy i we wsiach: Zańki, Rożki, Dudziazy, Pawui, Rudawka, Raniewiczy, Gonczary, Kowali,—prosimy Pana Inspektora ludowych szkoł dozwolić naszym dzieciem uczić się w początkowych szkołach na języku naszym rodnym białoruskiem z nauczeniem językupolskiemu.

С. Буйко, Жук Канстанцін, Іван Жук, Жэвлюк, Софія Жук, Анна Жук, Якуб Мурчык, Леон Валынчык, Ольга Матэшук, Юлія Марцінкевіч, Анна Рамля, Байко Сьцепаніда. Осіп Савко, Иван Прыйш, П. Гобец, Вікентій Словеняк, Міхаіл Васілюк, Иван Валынчык, Міхаіл Смочок, Antoni Smoczek, М. Песняк, П. Гутор, К. Гутор, Марыя Песняк, Міхаіл Крыштофік, Евстафій Песняк, Іван Сьцепанюк, Сьцепаніда Ішчык, Грыгор Каральчук, М. Грышко, Васіль Крупчык, Міхаіл Жа-

СЯЛЯНЕ! Не давайце галасоў за здраднікаў-аляксюкоўцаў!

біноні, Аляксандр Вошчыловіч, А. Вошчыловіч, Аляксей Романчук, Wojciejszczyk Andrej, Szcześnik Wasil, Kuczynska Krystyna, Міхаіл Романчук, А. Крупчык, Сямён Жук, Сямён Шэлест, Boris Januszkiewicz, Kościuk Michał, Kłyszka Andrej, Kościuk Chiinka, Antoni Peliksza, Kasaroski, Mina Surowiec Bazyl Lach, Rudak Michał, O. Rusak, Jan Kiedzik Иван Кавальчук, Wincenty Sztop.

Da hetaj prośby byŭ dałučany śpis 110 biełaruskich dziaciej, dla jakich škoła.

U adkaz na swaju prośbu sialanie dastali takuju papieru:

Min. W. R. i Ośw. Publ. Kopija.

Inspektor szkolny
pow. Wołkowyskiego
dn. 15. XI- 1921 h.
№2300.

Do
W. P. Wiernikowskiego
Narkiza w Swisłoczy.

W odpowiedź na pismo pana z dnia 23X-go r. b. Niniejszem komynikuę, iż nie mogę udzielić zezwolenia na odwarcie w Swisłoczy szkoły z językiem wykładowym białoruskim.

Inspektor szkolny
powiatu Wołkowyskiego
Hołd..

(dalej podpiś nierazborčywa).

* * *

U sprawie zabarony biełaruskaj škoły ŭ Świsłačy my atrymali ad adnaho z akaličnych žycharoŭ karespandencyju, jakuju tut i drukujem. Jana daje asabliwa jarki abraz tej „woli“, jakoj karystajucca biełarusy pad Polščaj!

Try hady prajšło z taho času, jak pryjšli da nas pałaki, i ŭsie hetyja try hady zmahajecca biełaruski narod za swaje prawy nacyjanalnaja kulturnyja, za swoj ekanamičny byt, za prawy čaławieka. Ciažkoje niaroŭnaje heta zmahańnie, ale ničoha nia zrobiš — widać, taki los nam wypaŭ: papakutawać jašče niejki čas

Nidzie tak nie adčuwajecca polska-panski teror, jak u Horadzienščynie. Ale, nia hledziačy na ŭsio heta, sialanie śmieła dabiwajucca swaich praŭ na čaławiečaje žyćcio. Praŭda, pakul što ŭsie dobryja pačynańni dušacca panami, asabliwa pačynańni kulturnyja Tut prosta pany biaz žadnaha ab'jaśnieńnia stawiać swajo „nie pozwalam“, dyj bolš ničoha!

Tak, u Swisłačy, Waŭkawyskaha paw., sialanie padali školnamu inspektaru padańnie z prośbaju adčynić u m. Swisłačy biełaruskuju škołu. Dziaciej zapisałasia ŭsiaho sto dziesiać čaławiek. Paśla padačy padańnia prajšło kala šaści niadziel, a ab škołcy ni słuchu, ni duchu. Pasyłali da pana inspektara i delehataŭ z prośbaj chutčej adčynić škołu. I woś—nareščie 17 listapada atrymali adkaz: „nie pozwalam“!—biez abjaśnieńnia nawiet pryčyny.

Pra hetaha inspektara treba skazać praŭdu, što heta asoba znamianitaja. ŭ 1919 hadu, kali pryšli da naš palaki, dyk pa jaho zahadu byli začyniany ŭsie biełaruskija škołki, istnawaŭšyja ŭ pawiecie. U toj samy hod hawaryŭ jon adnamu biełarusu-wučycialu, jaki dabiwaŭsia pazwalennia adčynić biełaruskuju škołu, što biełaruskaju mowaju haworać tolki mužyki dy batraki. Usiaki-ž kulturny čaławiek pawinien hawaryć pierš-napierš pa-polsku, nu a potym pa-francusku anhielsku i h. d. Kab źniščyć ŭsio biełaruskaje, kab wytrawić nawet duch biełaruski, zahadywaje jon wučycialom swaim wymahać ad baćkoŭ prawasłaŭnych padpiski, kab dzieci ich wučylisia wiery pa polsku.

Hetak robicca ŭ m. Swisłačy. Nawet ksiondz tutejšy zabyŭsia malicca Bohu, a kožnuju niadzielu ŭsio wajuje proci biełarusaŭ. Pry hetym jon nikoli nie nazywaje biełaruskich pracaŭnikoŭ, biełarusami, a „ruskimi“. Jon kaža, što hetyja „ruskija ahitatary“ chočuć źniščyć św. Kaścioł i „polskuju“ wieru. što ich treba bajacca, jak antychrysta, jak lucypara. Parafijanam prykazywaje, kab danasili jamu ab hetkich ludziach. Ale i hetaha mała. Kab zaŭsim zadušyć ruch biełaruski, niadaŭno byŭ dadzieny na słowach tajny prykaz usim sołtysam, kab usich ludzziej z druhich wiosak, jakija buduć chadzić „biaz pryčyny,“ aryštoŭwać i pryhniać u hminu. Za heta jany buduć dastawać nahradu.

Nu, dy ničoha: zaŭsiody najwialikšyja marazy bywajuć wiasnoj, muchi kusajucca pierad śmierciu. Budziem wieryć, što i polskija pany kusajucca tak pierad swaim kancom!

Zabałotny.

Народ і панства.

Народ Беларускі—гэта народ сялянскі, народ зямлі і працы, і за тым яго інтарэсы рэзка разыходзяцца з інтарэсамі панства—земляўласнікаў. Найбольш яркія страніцы з гісторыі Беларускага народу - гэта тыя, на якіх апісана барацьба Беларусаў за іх правы, за нацыянальную незалежнасьць, пры каторай толькі і магчыма эканамічная незалежнасьць народных масаў ад панства. У барацьбе за правы Беларускага народу першае выступіла мяшчанства. Ужо ў XvI сталецьці беларускае мяшчанства было арганізавана ў слаўныя ў гісторыі брацтвы і крэпка бараніла правы Беларускага народу ад захватніцкіх апэтытаў польскіх магнатаў, за якімі сьледам ішла абпаячаная беларуская шляхта—гэтыя адступнікі і здраднікі свайго народу. Абязсіленыя ў няроўнай барацьбе, беларускія месты спачатку пачалі былі пераходзіць на старану Масквы, робячы з ею вельмі карысныя для сябе ўмовы, але як толькі пабачылі, што Масква стараецца налажыць на вольнасьці беларускіх мест сваю цяжкую руку, дык сталі барóцца і проці маскоўскае ўлады,—прыкладам магілеўцы ў 1661 годзе справілі маскоўскаму гарнізону крывавую лазьню, выразаўшы 7.000 маскоўскіх жаўнераў. Стаўшыся цэнтрамі беларускага культурна-нацыянальнага руху, нашы месты нейкі час мелі даволі сілы дзеля адпору двайному націску польскага панства і маскоўшчыны. Але тут надыйшлі цяжкія маскоўска-польска-швэдзкія войны, якія зусім змарнавалі месты Беларусі і зьнішчылі ў іх беларускі культурны элемэнт. С таго часу беларускім асталася толькі сялянства, стагнаўшае пад уціскам паноў-земляўласьнікаў.

Паводле польскіх досьледаў,*) да польскіх паноў у Беларусі наагул належыць каля 45 проц. усіх зямельных абшараў, а ў самай толькі Віленшчыне—каля 60 проц.; значыцца, больш паловы тае зямлі, якую сваімі мазалістымі рукамі выраблае віленскі беларус-сялянін, належыць не да яго, а да паляка-абшарніка. Ня дзіва, што паны робяць усё, што толькі магчыма, каб ня выпусьціць з сваіх рук улады над нашым краем ды ня даць беларускаму сялянству самому стацца гаспадарам у сваей Бацькаўшчыне. Ясна, што перавага сялянства — гэта канец панскае ўлады. Гэта ведаюць паны вельмі добра, ды ведаюць і тое, што цяпер нельга ўжо — з увагі на ўвесь сьвет—па старому валадзець народам і уціскаць яго: сусьветная дэмакратыя лічыцца ня з голасам панства, а працоўных масаў. Справа Віленшчыны таксама аканчальна ня вырашана, і трэба зварачацца да народу. Ды народ ведае, што дадуць яму панскія пасулы: ён ужо перастаў верыць паном. І вось, як некалі, зьяўляюцца зноў паміж намі здраднікі і адступнікі, якія за панскія грошы і панскую ласку бяруцца баламуціць наш народ. Дзеля гэтае мэты творацца спэцыяльныя арганізацыі — кшталтам „Краёвай Сувязі“; дзеля гэтага наймаюць Аляксюка, склікаюць гучныя зьезды, даюцца крывадушна абяцанкі, якіх ніхто і ніколі ня зьбіраецца спаўняць, — і ўсё гэта толькі з тэй мэтай, каб абаламуціць народ наш, каб ён сам сваімі рукамі зацягнуў пятлю на сваей шыі.

Але народ Беларускі ўжо збудзіўся і, агледзеўшыся навакол, распазнаў, хто яго вораг і хто яму брат. Народ пазнаў, што дарога сялянства і дарога панства — розныя і ніколі ня зыйдуцца. І народ ня дасьць ніякім панскім наймітам зьвясьці сябе з тае дарогі, якая вядзе да запраўднага вызваленьня Беларускага працоўнага народу!

*) Świechowski—„Żywioł Polski“ i W. Olszewski- „Znaczenia gospodarcze Litwy i Białej Rusi“.

„Чужым“.

Мы вас прынялі хлебам і соляй,
Людзі чужыя;
Устрэлі вас ласкай нашага поля
Кветкі жывыя.
Нашы сасонкі шумнага бора
Далі вам хаты;
Далі загонаў нашых разоры
Гонар багаты.
Пух і аўчынкі нашага хову
Грэлі зімою,
Птушкі вам гралі з нашай дубровы
Гымны вясною.
Ценем тулілі вас у сьпякоту
Нашы чарэсьні;
Нашыя жнейкі ў жніўну работу
Пелі вам песьні.
Вашым патомкам нашыя маткі
Казкі складалі;
У сэрцах дзіцячых праўдаў пачаткі
Сеў засявалі.
Верны славянскім спадкам, браточна
У госьцях вас мелі
І шанавалі людзка, сьвяточна
У будні, ў нядзелі.
. . . .
Сотні лет песьцім днямі і ночай
Госьця на шыі:
Зьмея, што з пуняў скарбы валоча,
— Скарбы чужыя.
Вы ўжо забылі, людзі здарэньня,
Дзе ваш прыпынак,
Вывялі ў гандаль славу, сумленьне,
Праўду на рынак.
Сьлепа зракліся сораму, ўвагі;
У хорамы селі.
Брацьцям жа ўзьдзелі лапці, сярмягі,
Торбы надзелі...
Людзі чужыя! Хтось калісь зьліча
Вашу нам шкоду!
Зьліча праступкі, к суду пакліча
Крыўда народу!..

Янка Купала.

Як робяцца выбары у сойм.

Варшава кіруе выбарамі.

Паводле артыкулу 13 выбарнага закону, галоўнага камісара для ўсіх 8 акругоў „Сярэдняе Літвы“ назначае старшыня тымчасовае ўрадовае камісіі, а галоўнага камісара для тых двух паветаў, якія далучаны да „Сярэдняе Літвы“ толькі на час выбараў і якія Польшча лічыць ужо „сваімі“, — варшаўскі ўрад.

Апошні і назначыў на „свае“ два паветы пана Забежоўскага, але таго-ж, пана, хоць ён і не грамадзянін „Сярэдняе Літвы“ і нічога супольнага з нашым краем ня мае, назначыў Віленскі ўрад на галоўнага камісара рэшты выборчага абшару. Такім чынам варшаўскі чыноўнік кіруе ўсей справай выбараў, і трэба думаць, што ён патрапіць павясьці выбары так, як патрабуе Варшава...

„Свабода слова“.

Паводле дэкрэту старшыні тымчасовае ўрадуючае камісіі „Сярэдняе Літвы“ № 427, кожнага, хто будзе агітаваць проці ўчасьця ў выбарах, маняцца караць вастрогам да аднаго году.

Гэты дэкрэт вызывае агульнае зьдзіўленьне: учасьце ў выбарах — гэта не абавязак, а права кожнага грамадзяніна, — значыць, кожнаму пакідаецца поўная воля карыстацца з гэтага права, або не карыстацца. Дык якім чынам можа быць „праступкам“ агітацыя за тое, каб беларусы не карысталіся сваім правам.

Вось лішні доказ, як польская ўлада разумее „свабоду выбараў“! Не хватае толькі аднаго: каб польскія жандары гвалтам гналі штыхамі народ „свабодна“ падаваць галасы!..

Яны прададуць вас у Сойме паном!

„Прыказ па арміі."

У польскай эндэцкай газэце „Rzeczpospolita' надрукавана адозва „Stowarzyszenia Nauczycielstwa Polskiego powiatu Oszmiańskiego", у якой паміж іншым чытаем:

„Астаньмася ўсе на сьвяточны час на нашых становішчах і за гэты час ладзьма ў школах асьведамляючыя сходкі бацькоў, вучняў і наагул усіх выбаршчыкаў, каб усе прынялі ўчасьце ў галасаваньні 8 студня, і пільнуйма, каб у мясцовасьцях, да якіх сягаюць нашы ўплывы, ніводзін голас не прапаў для Польшчы!"

А ў канцы гаворыцца аб тым, каб напярэдадні выбараў, значыцца 7 студня, ўсе школы склікалі яшчэ раз сходкі выбаршчыкаў і каб агітавалі „на карысьць Нашай Вольнай, Незалежнай і Аб'яднанай Айчызны," —ведама, Польшчы.

Калі-б нешта падобнае зрабілі беларускія вучыцялі, іх бы той час павыганялі з іх школ, бо-ж для беларусаў — гэта непэдагагічна заводзіць палітыку ў школах! Але для польскіх школ — гэта нічога. Наадварот: адозва падпісана на першым месцы панам школьным інспэктарам Ашмянскага павету, Локуціевскім—значыцца, гэта ёсьць афіцыяльны прыказ школьнага начальства, дадзены па арміі польскіх вучыцялёў!

Вось, дзеля чаго за апошніх паўгода пазакрываны блізу ўсе беларускія школы і абернены ў польскія. Польскія вучыцялі — гэта не пэдагогі, а польскія палітычныя агенты, якім загадана ня вучыць народ, а толькі польшчыць і агітаваць за прылучэньне нашага краю да Польшчы..

ХРОНІКА

У Беларускім Нацыянальным Камітэце

У пачатку гэтага месяца ў Беларускім Нацыянальным Камітэце адбылося штагоднае абнаўленьне мандатаў сяброў Камітэту, прадстаўнікоў ад усіх беларускіх таварыстваў і установ, арганізацыі ксяндзоў-беларусаў, праваслаўнага духавенства і галоўных палітычных партый (соцыяльдэмакраты, соцыялістаў-рэвалюцыянераў і хрысьціянскай дэмакраты).

У склад Камітэту цяпер уваходзіць каля 40 асоб,—пераважна ўсё вядомыя беларускія дзеячы ў розных галінах нацыянальнае працы. Гэтак Беларускія Нацыянальны Камітэт становіць запраўднае і поўнае прадстаўніцтва ўсяго арганізованага беларускага грамадзянства, што мае асаблівую вагу ў гэткі важны палітычны мамэнт. За межамі Камітэту апынуўся толькі Аляксюк з сваей прадажнай хэўрай, бо ад яго арганізованае беларускае грамадзяцтва адвярнулася ўжо даўно і выключыла з сваей сям'і.

У зьвязку з абнаўленьнем складу Камітэту адбыліся такжа перавыбары прэзыдыму Камітэту. Да апошняга ўвайшлі: І. Краскоўскі (старшына). А. Луцкевіч (віцэ-старшына), ксёндз А. Станкевіч (віцэ-старшына), Пракулевіч (скарбнік) і А. Якубецкі (сэкрэтар). Паводле партыйнае прыналежнасьці—два беспартыйныя, 1 соц.-дэм., 1 соц.-рэв., 1 хрысьц.-дэм.

Кандыдатура кс. Пятроўскага.

Польская народніцкая арганізацыя „Одродзэне" зьвярнулася да вядомага беларускага дзеяча, кс. Пятроўскага, з прапазыцыяй даць пазваленьне паставіць яго імя на першым месцы ў выбарным сьпіску „Одродзэня".

Кс. Пятроўскі, аднак, адмовіўся ад выстаўленьня сваей кандыдатуры ў сойм.

Падгалоскі аляксюкоўскага зьезду.

Выявілася, што салю Польскага Работніцкага Дому даў Аляксюку пад зьезд асабіста пан А. Заштовт—бяз ведама і бяз згоды работніцкіх арганізацый. З гэтае прычыны на засяданьні Цэнтральнага Бюро Работніцкіх Прафэсыянальных Раюзаў (клясовых) падняліся вострыя пратэсты проці дапушчэньня аляксюкоўцаў ў Работніцк. Дом. Тое-ж было і на партыйным сходзе П. П. С. Л. і Б.

Пан Заштовт тлумачыўся, што ён даў салю Аляксюку толькі праз непаразуменьне, атрымаўшы праз тэлефон паведамленьне аб беларускім зьезьдзе, ды ня ведаючы, што зьезд зьбірае Аляксюк.

Новая польская газэта пабеларуску.

22 сьнежня пачала выхадзіць у Вільні новая газэта па беларуску пад назовам „Раніца". За рэдактара падпісаны пан Вацлаў Адамовіч. Газэта прызывае народ да учасьця ў выбарах у польскі сойм у Вільні і, як мага, бароніць.

У першай стацьці першага нумару надрукованы подлы данос на ўсіх беларускіх дзеячоў, якіх палякі і Аляксюк не здалелі падкупіць грашмі: так сказана, быццам яны ўсё—«бальшавікі". Дагэтуль такой брахнёй на беларусаў занімалася польская жандармэрыя, дэфэнзыва і „Страж Крэсова". Як відаць, „Раніца"—новы таварыш" названых установаў і становіць якбыццам беларускі аддзел дэфэнзывы!..

Бойкот Аляксюка і яго хэўры.

Усё беларускае арганізованае грамадзянства пачало адкрыта бойкот „аляксюкоўцаў". Ніхто з беларускіх дзеячоў не падае ім рукі.

„Кепскія паперы"!

Як пахваляецца „Раніца", Аляксюка з кумпаніяй прынімаў у Варшаве прэзыдэнт польскіх міністраў, пан Поніковскі, а 20 гэтага сьнежня меўся прыняць сам Начальнік Польскага Гаспадарства, пан Язэп Пілсудскі.

Відаць, кепска стаіць польская справа ў Віленшчыне, калі навет людзі прымушаны „рабіць палітыку" з крымінальным праступнікам Аляксюком і падаваць яму руку...

Сялянскі Зьезд.

Прафэсыянальны Саюз беззямельных і малазямельных работнікаў „Сярэдняе Літвы" склікаў на другі дзень Каляд (26 сьнежня) зьезд малазямельнага і беззямельнага сялянства.

Кожная вёска і двор маюць права прысылаць па двух прадстаўнікоў, а калёніі і фальваркі—па адным. Прадстаўнікі павінны мець з сабой копіі пратаколаў аб выбары іх і ежы на два дні. Зьяўляцца трэба загадзя у Канцэлярыю Саюзу (Віленская 12).

Парадак дня Зьезду: 1) Справаздача кіраўніцтва Саюзу, 2) Выбары Цэнтральнага Бюро і 3) Бягучыя справы,

З жыцьця вескі.

Нядоля бежанцаў.

У мястэчку Крынках адзін бежанец зьвярнуўся ў мяйсцовую бальніцу, дзе спадзяваўся вылячыцца ад тыфусу. Яго тут ня прынялі, Парадзіўшыся з людзьмі, ён зьвярнуўся да раённага начальніка. Начальнік сказаў, што не яго дзела займацца хворымі. Хворы выйшаў, пачуў сябе слаба і лёг на вуліцы на першыя папаўшыяся сані, дзе і аддаў душу Богу—памёр.

Як адбываюцца валасныя выбары.

18-га сьнежня адбыўся ў воласьці Язенскай, Дзісьненскага павету, сход, на які мусіла сабрацьба 120 выбаршчыкаў; але перад гэтым арыштавалі невядома за што трох чалавек: Тарарака і Міхасевіча перад выбарамі, а ў дзень выбараў Мятлу Мацьвея. Павінны былі выбраць Раду валасную. Сабраліся ўсе ў 8 гадзін рана; было сказана, што калі хто ня явіцца, таго не дапусьцяць да выбараў. Ад 8 гадзін чуць не да вечара начальства не паказвалася, і выбары не пачыналіся; толькі а 4 гадз. явіўся нейкі рэфэрэнт ад старасты, які сказаў прамову, кажучы, што польская дэмакратычная ўлада дазваляе самому народу кіравацца так, як ён сам хоча. „Выбярэце худую Раду, будзе вам худа, а калі добрую, то будзе вам добра". Але выйшла інакш. Калі сталі выбіраць дык патрэбавалі сьпісы кандыдатаў, а раней казалі, каб гэтых сьпісаў ня пісалі. Адзін солтыс раёнаы падаў сьпіс, напісаны грамадзянінам Грыневічам, у які ўвыйшлі: два браты Грыневічы і яшчэ чатыры абшарнікі, якіх народ не хацеў выбіраць. Падняўся крык; усе выбаршчыкі былі проціў гэтага сьпісу. Тады пазволілі зрабіць перарыў, каб зрабіць другі сьпіс. Не пасьпелі выйшаўшыя сяляне напісаць і пяцёх кандыдатаў, як паліцэйскі сказаў, што пара ўжо падаваць сьпіс. Сабраліся ў будынку воласьці, а там сказалі: так як другога сьпісу няма, дык выбарнымі аказаліся 2 Грыневічы і Ко.

Гэтыя Грыневічы прадалі ў Глыбокае сена і прымусілі сялян ад гміны вазіць яго на сваіх падводах.

Пасьля таго, як быў прачытаны гэты самы сьпіс, сялян сілаю выганялі вон з валаснога будынку.

З ЛІДЧЫНЫ.

Паважаны Рэдактар!

Прашу зьмясьціць у газэтах некальлі гэтых слоў. Можа і змаўчаў-бы, але дальбог не магу выдзяржаць і не магу глядзець на гэта, як людзей ашукваюць.

Было гэта так. Гаварылі людзі, гаварылі, што будзе галасаваньне, аж дагаварыліся. Прыяжджай нарэшце нейкі франт кульгавы і да нас. Прыйшоў да аднаго селяніна у хату і сказаў, каб усіх людзей яму склікалі; зараз жа гэта і зрабілі. Клікнулі і мяне; прышоў я і сеў на зэдліку там недалёка яго і чакаю, што-ж тут будзе.

Гэты кульгавы зараз і пачаў гаварыць, што ён прыехаў сюды пазапісваць людзей, гаварыў, што „куды хочаце, туды пішэцеся; прымусу няма ніякага, бо Амэрыка хоча знаць, куды гэта старана хоча належаць." Казаў, што тутака йшчэ ня Польшч, але хочуць прылучыць да Польшчы.

Думаю сабе: добры чалавек кажа, што мусу няма, куды хто хоча туды няхай і пішацца. Ну, скончыў мову, так я кажу: „Так прашу, пане, пісаць." Пачаў пісаць. Запісаў аднаго чалавека і пытае: «дзе пан — хцэ належаць?.» Так чалавек кажа: „да Польшчы". Пісаў, пісаў, — дайшло і да мяне; а я угледаўся і чуў ад другога гэтакага самага пішчыка, што ня трэба пісаць, куды хто, а толькі пісаць. хто мае права галасаваць. — Ен і пытае мяне, куды я? Кажу: „да Беларусі". Так ён, кажа, што хто хоча у другі бок, а не да Польшчы. то ня будзе пісаць таго. Так я і пачаў з ім спорыць, што пан ня правільна робіш спіс: мусіш пісаць усіх, хто мае 22 гады і хто ня быў пад судом. А ён усё сваё мне правіць. Я зараз кажу: пакажы спіс! Паглядзеў, аж там гэтага і няма, куды хто хоча. А ён, значыць, хоча сьпісаць толькі тых людзей, што хочуць да Польшчы, і разаслаць павесткі на выбары толькі тым, хто напэўна падасьць голас за Польшч, значыць, за Літву ані за Беларусь і галасоў ня будзе, бо хто хацеў запісацца да Літвы ці Беларусі, то яго не запісалі ў выбарны сьпіс.

Дарагія людцэ і пан Рэдактар, радзьце што рабіць, а то надтаж велькае ашуканства паўстала.

Пасьля вялікага спору неяк такі і мяне запісаў і далей ужо ня пытаўся, куды хто хоча, а пісаў усіх, навет забыўся пытаць, хто пад судом ці быў.

Чуў яшчэ тое, што ў Лебядзе у воласьці газэты Беларускія прыказана з Ліды войту і пісару не даваць людзям, а паліць, ці да Ліды адсылаць.

Рабеце, якую раду, бо ўсё нашае пісьмо паляць.

Бл. Селянін.

Razwał kooperacyi.

U Wilni, prociŭ Wilenskaha Sajuzu Kooperatywaŭ, pačaŭsia pachod z boku jak polskaj hrupy supracoŭnikaŭ hetaha samaha Sajuzu, tak sama i z boku uładу Litwy Środkowaj.

Try supracoŭniki: Wolski, (prysłany z Waršawy), Cybulka (byŭšy Kiraŭnik Kooperatyŭnaha Addziełu u Saŭnarchozi balšawickaha Litbiełu) i kabiecina-Sztanhe, pačali rabić pa sławam henaha samaha Wolskaha „dwarcowuju rewalucyju" u Sajuzi. Padławiŭšy, što Uprawa Sajuzu, załažyŭšy ŭziaty cukar z Departamentu, jaho ŭ časie nia wykupiła, a adzin siabra Uprawy (Paŭłowič), biez karyści dla siabie, jak jon sam saznaŭsia, zrabiŭ fiktyŭnyja rachunki, heta kampanija pačała „rewalucyju" z ŭsiej Uprawaj Sajuzu. Uprawa padałasia u adstaŭku. Rewizyjnaja Kamisija zrabiła rewiziju, — Wolski i jaho Kamisija winawaciać, što jana była strašnaja. Rada Sajuzu razsledziła ŭsio dzieła — Wolski i Kampanija niezdawolen, bo pawodle jaho i Rada staronnaja i damahajecca ad budučaha źjezdu adstranieńnia Rady. Usie sprawy biez należnaj prawierki Rewiz. Kam. Sajuzu, Wolski i Kampanija apublikowawajuć u hazetach. Biaz zhody časowaj Uprawy Sajuzu, wybranaj Radaj, Cybulka sklikaje źjezd kooperatywaŭ Wilenska-Świancianskaha rajonu i, niepawiadomiŭšy ab hetym źjeździ ŭłady Sajuzu, jakaja nie mahła być na źjezdzi, wynosiać rezalucyju, abwinawačywajučy mnohija asoby nia wysłuchaŭšy ich apraŭdańnia.

Na Źjezdzi Sajuzu, jaki budzie 28 śniežnia peŭna budzie wiaścisia baraćba, kab adstranić ad Sajuzu nie „palakoŭ" jakija pieraškadžajuć šowinistyčnym planam Wolskaha i K-o.

Tym časam Dyrektar Departamentu Aprawizacyi pałkoŭnik Wiendziagolski, u hety samy dzień, jak p. Wolski padaje zajawu ab nieparadkach u Wilenskim Sajuzi Kooperatywaŭ pieradaje, prakuroru sprawu ab nieprawilnym padzieli cukru.

Praz niekulki dzion Departament Skarbu abkładaje Sajuz padatkam 1.120.000; ad prybyli za 1920 hod, jakoj nia było.

Daŭno užo paŭstaŭšaja dumka, kab zrujnawać Wilenski Sajuz Kooperatywaŭ, stwarajučy niejki nowy „Ahulna-krajowy" Sajuz, z jakoj nie saŭsim zhadžałasia byŭšaja Uprawa Sajuzu, peŭna što budzie wysunuta na źjezdzi paŭnamocnikaŭ Sajuzu 28 śnieżnia.

A dalej taksama peŭna, što buduć znajdzieny jakija-niebudź pryčyny, kab tak, ci inakš saŭsim začynić Sajuz.

Kooperatar.

Рэдактар-Выдавец В. Лемяш.

Друкарня „ДРУК", Субач, 2.